# Ён раскрыў нам скарбы Радзімы

Віртуальная кніжная выстава
да 65-годдзя
беларускага пісьменніка
Уладзіміра Іванавіча Ягоўдзіка



# Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік нарадзіўся *14* лютага *1956* года



**Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік** нарадзіўся ў вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Рана застаўся без бацькоў. Вучыўся ў Дзятлаўскай, Слонімскай, Зэльвенскай школах-інтэрнатах.

У *1978* годзе скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

карэспандэнтам Брэсцкай абласной газеты «**Заря**», рэдактарам **Брэсцкай абласной студыі тэлебачання**. У *1982 –1990* гг. – супрацоўнік штотыднёвіка «**Літаратура і мастацтва**». У *1990 –2010* рэдактар часопіса «**Дзеці і мы**». Адначасова ў *1997 – 2003* гадах – галоўны рэдактар

Дэбютаваў у друку вершамі ў *1972* г. (газета «Гродзенская праўда»). Выдаў кнігі прозы для дарослых «**Стронга**» *(1984)*, «**Вочы Начніцы**» (бібліятэка часопіса «Маладосць», *1989)*, «**Прыручэнне птушкі**» *(1989)*, «**Шчыраю ноччу**» *(2009)*. Аўтар мастацкага альбома «**Алена**

# Першая кніга прозы «**Стронга**» *(1984)*



# Кніга прозы «**Вочы начніцы**» *(1989)*



# Кніга прозы «**Прыручэнне птушкі**» *(1989)*



# Кніга прозы «**Шчыраю ноччу**» *(2009)*



Выступае у перыядычным друку як **літаратурны крытык** . У *1995* годзе выпусціў кнігу артыкулаў і эсэ пра дзеячаў беларускай культуры «**Белыя рысы на чорным полі**». У кнізе гаворыцца пра пісьменнікаў – З. Верас, М. Гарэцкага, Я. Брыля, У. Караткевіча і многіх іншых , пра тых, хто з'яўляецца яскравым прыкладам станаўлення беларускай духоўнасці і культуры

# Кніга артыкулаў і эсэ пра дзеячаў беларускай культуры «**Белыя рысы на чорным полі**» *(1995)*



Вядомы як таленавіты **дзіцячы пісьменнік**. Актыўна далучае дзяцей да фальклорных скарбаў. Выдаў кнігу казак «**Сонейка, свяці**!» *(1988)*, з майстэрствам пераказаў для дзяцей беларускія паданні і легенды ў кнізе

# Зборнік казак «**Сонейка**, **сяцці**!» (1988)



# Зборнік беларускіх легенд і паданняў «**Заклятыя скарбы**» (1992)



Літаратурная аповесць-казка «**Янка і Ружа**» *(1993)* заснавана на народных матывах і раскрывае сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы. Янка здзяйсняе адметны па сіле гераізму подзвіг, вырашальны для будучыні народа, перамагае цёмныя сілы пры

# Аповесць-казка «**Янка і Ружа**» *(1993)*



Народныя легенды, паданні, загадкі, лічылкі, скорагаворкі, забаўлянкі, дзіцячыя гульні ўдала ўключаны ў сюжэт твораў, прысвечаных роднай прыродзе: кнігі «**Ці вернецца князь Кук**?» *(1993)*, «**У царстве Вадзяніка**» *(1995)*, «**Дзівосны карабель**» *(1995)*, «**Грыбок, грыбок, выстаў лабок**» *(1997)*.

# Кніга пра птушак «**Ці вернецца князь Кук** *?» (1993)*



# Кніга апавяданняў «**У царстве Вадзяніка**» *(1995)*






# Кніга апавяданняў пра птушак і жывёл «**Дзівосны карабель**» (1995)



# Зборнік апавяданняў «**Грыбок, грыбок, выстаў лабок**» *(1997)*



Пісьменніка хвалююць праблемы экалогіі. Ён з'яўляецца заснавальнікам беларускага дзіцячага экалагічнага часопіса «**Лесавік**», які выдаваўся з *1995* года.



Важнае месца ў творчасці Уладзіміра Ягоўдзіка займае тэма гісторыі роднай зямлі. Менавіта гэты пісьменнік упершыню пераказаў для дзяцей славуты помнік пачатку *XII* стагоддзя «**Аповесць мінулых гадоў**» у *1995* годзе. З цікавасцю юныя чытачы сустрэлі «**Аповесць пра князёўну Рагнеду**» *(1995)* і «**Аповесць пра Усяслава Чарадзея**» *(1996)*.

# Старонкі летапісу «**Аповесць мінулых гадоў**» у пераказе У. Ягоўдзіка (1999)



# Кніга «**Аповесць пра князёўну Рагнеду**» *(1995)*



«**Бабуліна варта**». У кнізе расказваецца пра кветкі, ягады і грыбы, што растуць на Беларусі, а таксама пра птушак, жывёл і вадзяную жыўнасць, якія сустракаюцца на нашай зямлі. Завяршаюць кнігу чатыры аповесці-казкі, паводле якіх у розныя гады былі пастаўлены спектаклі на радыё і тэлебачанні, а таксама ў многіх тэатрах рэспублікі

# Зборнік прозы для дзяцей «**Бабуліна варта**» *(1999)*



**цудаў Беларусі**», прысвечаная гістарычнай і культурнай спадчыне Беларусі. Яна распачала аднаіменную серыю літаратурна-мастацкіх выданняў, ў якую таксама ўвайшла кніга «**На далонях вечнасці**» *(2010)*, напісаная ў сааўтарстве з Анатолем Бутэвічам, і яшчэ *6* кніг А. Бутэвіча *(*«У гасцях у вечнасці» *(2001)*, «Званы Нямігі» *(2002)*, «За наміткай гісторыі» *(2003)*, «Адвечны покліч Радзімы» *(2004)*, «Славутыя родам сваім» *(2006)* і

У кнізе «**Сем цудаў Беларусі**» Уладзімір Ягоўдзік у займальнай і даступнай для дзяцей форме распавядае пра Белавежскую пушчу, крыж-святыню Еўфрасінні Полацкай, «Біблію» Францыска Скарыны, Сынкавіцкую царкву-крэпасць пад Слонімам, Статут Вялікага княства Літоўскага, Слуцкія паясы і Нясвіжскі палац

# Гістарычная кніга «**Сем цудаў Беларусі**» *(1999)*



# Гістарычная кніга «**На далонях вечнасці**» *(2010)*



Для зборніка казак «**Царэўна ў зачараваным царстве**» *(2000)* пісьменнік пераказаў па свайму разуменню і сіле ў больш зразумелай форме *15* твораў з выдання казак рускага фалькларыста Афанасьева, таму што за паўтара стагоддзя з часу іх публікацыі многія словы ўстарэлі і патрабавалі тлумачэнняў

# Беларускія народныя казкі са збору А.М. Афанасьева «**Царэўна ў падземным царстве**» *(2000)*






нашай Радзімы прысвечана таксама кніга «**Менеск і яго браты**» *(2004)*. У кнігах «**Рэха турынага рога**» *(2002)* і «**Звярынец апошняга ледавіка**» *(2003)* сумяшчаюцца гістарычная і экалагічная тэмы – яны прысвечаны апісанню тых птушак і жывёл, якія нажаль зніклі, але ў мінулым насялялі

# Кніга гістарычных апавяданняў «**Менеск і яго браты**» *(2004)*



# Кніга апавяданняў «**Рэха турынага рога**» *(2002)*



# Кніга апавяданняў «**Звярынец апошняга ледавіка**» *(2003)*



Вельмі плённым для Уладзіміра Ягоўдзіка быў *2005* год. З друку выходзіць яго двухтомнік «**Выбранае**» у афармленні мастака Юрася Алісевіча. У двухтомнік увайшлі *7* тонкіх кніжак для дзяцей, якія раней выйшлі асобнымі выданнямі. Сярод іх «Птушыная дарога», «Нацыянальныя паркі Беларусі», «Менеск і яго браты», «Сонечныя пялёсткі» і іншыя. На міжнародным конкурсе ў Браціславе двухтомнік атрымаў ганаровую ўзнагароду ў намінацыі «Самае лепшае выдавецтва» за змест і цікава

# Кніга «**Выбранае**» у 2 тамах *(2005)*






# Кніга «**Нацыянальныя паркі і запаведнікі Беларусі**» *(2004)*



У *2007* годзе выйшла кніга «**Горсць ягод**» з перакладамі на рускую мову лепшых апавяданняў аб прыродзе Уладзіміра Ягоўдзіка. Апавяданні пераклаў Ул. Машкоў



серыя «**Скарбы Радзімы**», адрасаваная дзецям, падлеткам, а таксама дарослым, якія занепакояны станам роднай прыроды. Кнігі серыі насычаны малюнкамі і фотаздымкамі, легендамі і вершамі беларускіх пісьменнікаў. Гэтыя кнігі – своеасаблівая і вельмі цікавая энцыклапедыя для дзяцей і іх

У серыі «Скарбы Радзімы» кожны
зможа знайсці цікавую і даступную
інфармацыю пра:
асаблівасці розных **пор года** на



У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:

**рэкі і азёры** Беларусі






У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:

**нацыянальныя паркі** Беларусі















## У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра: **птушак** Беларусі












# У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:
# **жывёл** Беларусі



У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:
**матылькоў** Беларусі,



У серыі «**Скарбы Радзімы**» кожны зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:
**ягады**, якія можна знайсці ў лясах



зможа знайсці цікавую і даступную інфармацыю пра:

**вядомыя валуны** Беларусі – сляды



У серыі **«Скарбы Радзімы»** кожны
зможа знайсці цікавую і даступную
інфармацыю пра:
**крыніцы з гаючай вадой** на тэрыторыі



Уладзімір Ягоўдзік таксама выступае і як **драматург**. Ён напісаў для дзяцей п᾽есы, што ставіліся ў тэатрах краіны, на Беларускім радыё і тэлебачанні. У *2011* годзе выйшла кніга п᾽ес-казак для дзяцей «**Спеўны**

# Кніга п’ес-казак для дзяцей «**Спеўны кірмаш**» *(2011)*



У *2012* годзе выйшла кніга пісьменніка «**Сіні калодзеж**», у якую ўвайшлі *100* беларускіх легенд і паданняў у пераказе аўтара.



У *2013* годзе выйшла яшчэ адна кніга аб прыродзе «**Год-карагод**».



а потым – кніга апавяданняў і мініяцюр «**Лясныя таямніцы**», прысвечаная рэкам, азёрам і крыніцам



# і яшчэ адна кніга казак – «**Медзяны дзядок**».



У кнігу «**Медзяны дзядок**» *(2013)* увайшлі аповесць-казка «Янка і Ружа», а таксама беларускія народныя казкі і казкі народаў свету, перакладзеныя аўтарам на беларускую мову

Вельмі карыснай для школьнікаў атрымалася кніга «**Шлях Рагвалода**» *(2013)*, прысвечаная беларускай гісторыі.



Здзівіў літаратар выданнем «**Быў знак на небе**» *(2015)* – – кнігай аб прыродзе Беларусі ў з'явах і падзеях. У кнізе аўтар сабраў самыя цікавыя звесткі пра беларускую прыроду за тысячу гадоў, занатаваныя ў летапісах і на старонках друкаваных выданняў

# Кніга аб прыродзе
# «**Быў знак на небе**» *(2015)*



У 2016 годзе з'явілася невялічкая кніжка «**Прыродны азбукоўнік**». На старонках гэтай кнігі маленькія чытачы адкрыюць для сябе ўсе літары беларускага алфавіта, пазнаёмяцца з жывёламі і раслінамі,

# Кніга «**Прыродны азбукоўнік**» *(2016)*



У 2018 годзе выйшла кніга «**Кветкі дзівасілу**». У кнігу ўвайшлі творы пра прыроду роднага краю, пра птушак і жывёл, якія насяляюць нашы лясы («Сонечныя пялёсткі», «Ці вернецца князь Кук?», «Крылатая дружына»). Таксама аўтар знаёміць юных чытачоў з мінулым Беларусі, са значнымі гістарычнымі падзеямі і славутымі асобамі («Ветразі гарадзішча»)

# Кніга «**Кветкі дзівасілу**» *(2018)*



Уладзімір Ягоўдзік – лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі *(1993)* і літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра *(1994)*.

Вядомы і як літаратурны крытык, і як перакладчык з рускай і украінскай моў.

Творчасць Уладзіміра Ягоўдзіка займае істотнае месца ў сучаснай беларускай літаратуры.